
З місіяй у Мексіку

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
27.06.2021 00:00



Рэната Белая пакінула Гродна 12 гадоў таму. Скончыўшы школу, дзяўчына паехала ў Польшчу, дзе вучылася на факультэце польскай філалогіі, а нядаўна ў дадатак абараніла дыплом магістра тэалогіі. Жыве Рэната ў Кракаве, дзе піша для каталіцкага часопіса “Niedziela.pl” і вядзе “Ogród Maryi” (“Сад Марыі”) – каталіцкую супольнасць для жанчын, накіраваную на раскрыццё жаноцкасці і павышэнне чалавечай годнасці.

Акрамя гэтага, дзяўчына з’яўляецца місіянеркай. Два гады таму яна была на сваіх першых місіях у Мексіцы і, пранікнуўшыся пакутамі асобных груп людзей, неўзабаве ізноў збіраецца наведаць гэтую краіну. Мэта – спаткаць чалавека

“Я здаўна захаплялася асобамі, якія служаць у якасці місіянераў, могуць сарвацца і паехаць далёка, цалкам аддаючы сябе Божаму Провіду. І, зразумела,

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
27.06.2021 00:00

сама мела ў сэрцы глыбокае жаданне служыць людзям у якасці місіянеркі. Дзякуй Усявышняму, да майго жадання далучыліся спрыяльныя акалічнасці”, – дзеліцца Рэната.

†

Некалькі гадоў таму дзяўчына паехала працаваць у ЗША. Адтуль рукой падаць да Мексікі. Рэната, ведаючы, што гэтая краіна мае шмат унутраных праблем – карупцыя, наркотыкі, шматлікія забойствы, бездань розніцы паміж беднымі і багатымі, – вырашыла з’ездзіць у Мексіку, каб сваімі вачыма ўбачыць велічыню патрэбы.
“У першую чаргу, я накіравалася ў санктуарый Маці Божай Гвадэлупскай. Пасля правяла ў гэтым святым месцы шмат гадзін на малітве, просячы Святога Духа аб распазнанні сваіх прагненняў і дастатковасці сіл у імкненні служыць мексіканцам” , – распавядае дзяўчына.



Капліца са смецця

Неўзабаве Рэната апынулася ў Мексіцы ўжо ў якасці місіянеркі, адпаведна падрыхтаваная да таго, каб годна служыць людзям. Адно з месцаў, дзе ёй давялося быць памагатай – вялікая звалка смецця. ***“У Мексіцы сметнікі займаюць безліч гектараў зямлі, гэта сапраўдныя «горы смецця», вялізныя тэрыторыі, якім не бачна канца. І самае прыкрае, што на гэтых звалках гадамі жывуць людзі: будуюць сабе шалашы са смецця, нараджаюць і гадуюць там дзяцей, там жа і***

працуюць, сегрэгуючы адходы і здаючы іх на перапрацоўку. Найбольш мяне ўразіла тое, што нягледзячы на нястомны клопат пра заспакойванне першасных патрэб яны клапоцяцца і пра духоўнае развіццё. Пасярод звалкі пабудавана капліца з кавалкаў дошак, фанеры і пластыку. Унутры яна цалкам упрыгожана вялікай колькасцю ружанцаў і крыжоў, таксама знойдзеных сярод смецця. І ведаеце, у такой прастаце я ўбачыла жывога Бога. Пра гэта мне засведчыў адзін з мясцовых беднякоў. У лахманах, сярод галечы, ён, адказваючы на маё пытанне «Дзе ж Бог?!», паказаў на сваё сэрца, усміхнуўся і сказаў: «Тут»”
, – узгадвае місіянерка.

Проста быць побач

Рэната ўпэўнена, што місіі – гэта не канкрэтны ўчынак. Гэта, перш за ўсё, прысутнасць. ***“Харaство місій у тым, што табе не трэба мець адмысловых здольнасцей, каб ехаць служыць. Людзі маюць патрэбу ва ўвазе, любові, пашане, а гэта можа даць кожны ў любой форме. Аднойчы я проста падышла да жабрака ля касцёла і запрасіла яго сесці побач са мной на св. Імшы. Ён палову службы паварочваўся да мяне і дзякаваў.***

Падышла да малой дзяўчынкі на сметніку і пачала гуляць з ёй – тая адразу «расквітнела» і зрабіла мне малюнак у падзяку. Іншаму я проста вымыла рукі, другога пакарміла, трэцяму падарыла медалік з выявай Марыі…” – дзеліцца Рэната.

Паводле слоў місіянеркі, менавіта такое служэнне моцна ўпісваецца ў стыль Хрыста, які ў евангельскія часы проста быў сярод людзей.

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
27.06.2021 00:00



З місіяй у Мексіку

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
27.06.2021 00:00

